А адбылося вось што. Пэўныя дзядзькі, а іх лёгка вылічыць па почырку, выкарысталі некалькіх маладых, даверлівых, шчырых, але малавопытных у падобнага кшталту інтрыжках літаратараў для збору подпісаў у абарону Васіля Быкава. Усе, да каго звярнуліся, ахвотна паставілі свае подпісы. Але не паспелі набраць 17, як паступіла каманда: досыць, давайце ў друк. Прааналізаваўшы подпісы, лялькаводы зразумелі: без Бураўкіна, які яшчэ з хрушчоўскіх часоў паслядоўна абараняе гонар і годнасць вялікага пісьменніка і паплечніка пры кожнай антыбыкаўскай кампаніі, якія метадычна паўтараюцца пры ўсіх уладах, гэты зварот будзе, мякка кажучы, малапераканаўчым, выкліча пытанні і непаразуменні. У апошнюю хвіліну ўвечары пазванілі на кватэру, і Генадзь Мікалаевіч, не ведаючы, што да яго звяртаюцца апошняга, даў згоду, каб быў і ягоны подпіс.

Вось так і з'явіўся гэты дакумент з 18 падпісантамі, які надта ж нагадвае згарбузаваную на вядомай ідэалагічнай кухні шматхадовую камбінацыю па ўкладанні адным стрэлам адразу двух зайцаў: даказаць, што вялікі пісьменнік не мае ў калег па пяры практычна ніякай падтрымкі — набралася ўсяго 18 з паўтысячы сябраў Саюза, значыць, святую праўду гавораць казіяткі, росцікавы і К°; а заадно мазнуць брудным пэцкалем па ўсім Саюзе пісьменнікаў, скампраметаваць творцаў перад дэмакратычнай грамадскасцю. Ды яшчэ рыкашэтам выклікаць сумненні ў Васіля Быкава адносна сваіх сяброў.

І пайшло, як па пісаным сцэнарыі. Журналістка стала высвятляць, хто з пісьменнікаў адмовіўся паставіць подпісы, кіраўніца Саюза, толкам не ведаючы, адкуль растуць ногі, нагаварыла абы-чаго па тэлефоне, і ўсё вылілася на старонкі шаноўнай "Народнай волі". А далей паехала на ўзровень асабістых крыўд і амбіцый.

Пра ўсё гэта і пісаць было б не варта: яўная правакацыя з подпісамі і лопнула б на з'ездзе пісьменнікаў, як мыльны пухір, калі высветлілася б, што наўрад набярэцца хоць 18 пісьменнікаў, якія ўхваляюць бессаромнае цкаванне знакамітага пісьменніка. Калі б раптам 23 мая ў 91-м нумары "Народнай волі" не з'явіўся артыкул Аляксандра Альхавога "Властители дум, кому вы подчинились?".

Кажу абсалютна шчыра: не хачу вінаваціць, кідаць каменьчыкі ў агарод паважанай мною газеты. Свабода слова ёсць свабода слова.

Але паколькі публікацыя Альхавога кранае прынцыповыя, канцэптуальныя праблемы не толькі Саюза пісьменнікаў, а ўвогуле культуры, грамадска-палітычнага жыцця, ёсць патрэба сёе-тое ўдакладніць для чытачоў "Народнай волі".

Адразу скажу: абсалютная большасць пісьменнікаў падзяляюць заклапочанасць, выказаную публіцыстам. Непрымальнай з'яўляецца метода Альхавога, якая мала чым адрозніваецца ад росцікаўска-казіятскай. Тая ж бойкасць пяра і слова, тое ж нежаданне лічыцца з рэаліямі, вольнае абыходжанне з фактамі, тое ж жаданне як мага балючай "уесці", абразіць апанента, тая ж заангажаванасць. Вось, калі ласка: "За последние годы Союз писателей Беларуси, простите меня за резкость, превращен, можно сказать, в проходной двор. Его членом может запросто стать и слишком пробивной, но явный недоучка, и графоман, и невежа, поднаторевший в бойком стихоплетстве и банальном гладкописании".

Пазнаяце? Не, гэта не Росцікаў і не Казіятка. Гэта — дэмакратычны публіцыст Альхавы "ўядае", б'е наводмаш кіраўніцу Саюза, заадно і ўсю творчую суполку. На жаль, у ягоных словах ёсць доля праўды з адным толькі маленькім удакладненнем: гэтая доля праўды пададзена са спазненнем як мінімум на чатыры гады, за якія шмат сцякло вады.

Што ж мы маем на самай справе "за последние годы"? Пасля заклапочанага абмеркавання на папярэднім пісьменніцкім з'ездзе стану прыёму ў Саюз наноўабраная рада пад кіраўніцтвам Някляева і Іпатавай прыняла рашучыя і эфектыўныя меры па пераадоленні ненармальнай тэндэнцыі колькаснага на шкоду якаснага раздзімання членства Саюза. Новая прыёмная камісія, сфарміраваная з прафесійных, прынцыповых людзей, за апошнія чатыры гады разгледзела 111 заяў і прыняла ў сябры Саюза толькі 44 пераважна маладога веку таленавітых, перспектыўных літаратараў, якія паспелі заявіць пра сябе ў самых паважаных і патрабавальных літаратурных выданнях, самастойнымі кніжкамі ў выдавецтвах, дзе надзвычай строгі аддзел творчага кантролю. Пра які прахадны двор можна весці гаворку, калі адсейваецца больш за 60 працэнтаў прэтэндэнтаў? Хочацца верыць, што Альхавы пісаў, абсалютна не ведаючы існага становішча ў Саюзе пісьменнікаў, што тым больш не робіць гонару публіцысту з прэтэнзіямі на глабальныя абагульненні, канцэптуальнае бачанне праблем.

Гэта інфармацыя для роздуму для зведзеных ў зман чытачоў "Народнай волі".

Але не тое галоўнае, што выклікае рашучае непрыманне пастулатаў публіцыста, ад многіх з якіх патыхае такім знаёмым, падзабыта-злавесным. Перш за ўсё ягоны тэзіс "о критериях и требованиях, предъявляемых Союзом к своим настоящим и потенциальным членам". Альхавы не ведае альбо забыў, што творчы саюз — не палітычная партыя, падобных да ягоных патрабаванняў да творчага Саюза не прад'яўляў нават сам Сталін, ва ўсялякім выпадку публічна. Болей таго, аднадумства, якога патрабуе ад пісьменнікаў публіцыст, няма сёння ні ў адной сучаснай палітычнай партыі. Напісаў нейкі недарэка халтуру пад назваю "Александр Лукашенко", якую не ўзялося друкаваць ніводнае паважанае выданне, апроч севаянчэўскай газеткі, — вінавата Вольга Іпатава, напісаў вядомы кампазітар на яўна прымітыўны тэкст вершаплёта песеньку "Товарищ президент" — зноў прэтэнзіі да кіраўніка Саюза, быццам яна абавязана выглядаць з-за пляча кожнага творцы, вадзіць, як у арміі, усіх строем. Запаланіла эстраду расійская папса — зноў вінаваты Саюз пісьменнікаў, і гэтак далей і таму падобнае. Было б смешна, калі б не рабілася сумна ад "канцэптуальных" прэтэнзій і патрабаванняў аўтара. Што ж ён патрабуе ад Саюза пісьменнікаў? Выключаць аўтараў опусаў кшталту "Александр Лукашенко", "Товарищ президент" з сябраў Саюза.

Гэта мы праходзілі ўжо. Дзіўную дэмакратыю прапануе нам дэмакратычны публіцыст.

Ды не трэба нікому падпарадкоўваць, перацягваць у сваю веру, як піша ў стылі казіяцка-зімоўскай іроніі Альхавы, валадароў дум. Марная гэта справа. Ніколі і нікому не ўдавалася падпарадкаваць таленты, у якіх ёсць свая вера — Праўда. А бездараў і кан'юнктуршчыкаў, якія гатовы служыць, падпарадкоўвацца, падначальвацца каму хочаш, хапае не толькі ў пісьменніцкім асяроддзі. Наедак і набытак ад іх невялікі. І ці Саюз пісьменнікаў вінаваты, што сучасныя менш пераборлівыя і патрабавальныя, чым некалі Сталін? Як кажуць, на бязрыб'і і рак рыба. Час расставіць усё і ўсіх па сваіх заслужаных месцах. Сёння росцікавы, казіяткі, чайкі лямантуюць злева: "Писатели идут против воли народа". І вось да хору далучаецца голас Альхавога справа: "Большинство наших "властителей дум" "творят" в кабинетах, на дачах, не слыша "гласа народа". Тыя ж інтанацыі, тыя ж іранічныя двухкоссі, тая ж мова. Поўны унісон. Сумны унісон.

"Ведь если звезды зажигают — значит, это кому-нибудь нужно", — цытую знакамітага паэта. Калі гэтак ладна цягнуць адну і тую ж мелодыю і левыя, і правыя, зазываючы валадароў дум да паслушэнства, падпарадкавання сваім ідалам, гэта таксама некаму патрэбна. Не валадарам дум без усялякага двукосся, канечне.

Эпіграмы

Раман ТАРМОЛА-МІРСКІ

Будуць біты...

Досыць Быкава бараніць!
Прыгадайце салдацкую
хватку:
Яго вораг і ў нашы дні
Будзе біты... саракапяткай.

Брава, дзяржава!

Зімоўскія, азаронкі —
Такая ідэй пазалота,
Такія хлопцы-каронкі
На зубы дзяржаўнага рота.

Запытанне

Што дзелім, калегі,
ў кішэнях пустых,
Адкуль нечаканыя сваркі?
Багацце ўсё тое ж у гэтых
і тых —
Разбітыя сэрцы... і чаркі.

Творчы крык

Багдановіч не самотны,
Кніжку маючы адну...
Я ж і з дваццаццю гаротны,
Шыю праўду і ману...
На сумленні стаўлю латкі,
Пахаджаю каля нар
Для дзяржаўнага парадку
За дзяржаўны ганарар.

Графскага роду

У фаворы графаманы,
Зараз на іх мода.
Дарагі і самы танны:
Графскага ўсё ж роду!

Лізун

Яшчэ адзін
кампліментаршчык,
А па-народнаму — лізун:
Усіх патрэбных толькі
лашчыць,
Для непатрэбных — ён бізун.

Прыкметы гісторыі

Пісьменнік, як ніколі,
хісткім стаў,
Пакутуе, бядак,
цяпер нямала:
Учора ўзводзілі на п'едэстал,
Сягоння — праганяюць
з п'едэстала.

Прадбачлівасць

Класік знакаміты ў прозе
Перад смерцю даў заяўку:
Толькі не ўслаўляйце ў бронзе,
Бо ўкрадуць на пераплаўку...

Намер

Мяне ўшчуваў апазіцыянер:
— Чаго пра Беларусь усё ты
енчыш?
Падпісаны ж з уладамі намер
Між чалавецтва жыць
па-чалавечы!

Прагноз

Што будзе на з'ездзе
пісьменнікаў?
Будуць творцы ўсе у злучцы —
Паставяць пытанні
Займеннікі,
А Клічнікі... адгукнуцца.



На здымку злева направа: пісьменнікі С. ЗАЛЫГІН (Расія), В. БЫКАЎ, А. АДАМОВІЧ. Васьмідзесятыя гады.

Табуном жыць лягчэй

Віктар КАРАМАЗАЎ

Апошнім часам, перад з'ездам пісьменнікаў, газеты, вольныя і няволь-ныя, раптам загаварылі пра нацыянальную літаратуру. "Народная воля" ўдарыла па пісьменніках прамой наводкай: "Уладары дум, каму вы падначаліліся?", "Няўжо Васіля Быкава падтрымліваюць усяго васемнаццаць пісьменнікаў з пяцісот?", "Дзе вашы новыя раманы, аповесці, паэмы, вершы?..", "Чаму маўчыце?..".

Вольга Іпатава як кіраўнік Саюза пісьменнікаў паспрабавала адказаць за ўсіх: "Наш пісьменнік — даволі інертная асоба". Яе адказ каго здзівіў, каго абурыў. Адчуўшы ці пачуўшы гэта, яна паспяшалася, як кажуць дыпламаты, дэзавуіраваць сваю заяву публікацыяй у газеце "Звязда", але не шмат каго перакана-ла. Па-першае, думку, што наш пісьменнік асоба інертная, мы ад яе і не толькі ад яе чулі раней; па-другое, выступленне ў "Звяздзе" атрымалася шматслоўным, з пазіцыі позы, быццам размова ідзе пра асабістыя крыўды, а не пра аўтарытэт СП і літаратуры. І пытанне засталося: няўжо беларускі пісьменнік такі абыякавы да лёсу краіны і народа, што яго хоць сёння можна спісаць у архіў? Бо гэта ж адно другога вартае і раўназначнае — быць інертным і быць непатрэбным часу, краіне, людзям.

Але калі гэта так, то хто з нас не інертны, і дзе, у якім полымі павінен гарэць сёння пісьменнік, каб не навесці на сябе цень інертнага абывацеля?

Тыдзень таму я быў у Гомелі на выдатным свяце паэзіі, якое сваім землякам падарыў адзін паэт — Міхась Башлакоў. І ён, і арганізацыйны камітэт запрасілі на свята кіраўнікоў СП, Іпатаву — таксама. Ніхто не прыехаў.

У руках у паэта была яго новая кніга "Світальныя коні", якая якраз у тыя дні выйшла з друкарні. У прадмове да кнігі вядомы паэт Юрый Фатнеў, які выдатна ведае ўсе тонкасці паэзіі, сказаў: "Гэта кніга незвычайная. Яна выдадзена на ахвяраванні сяброў, знаёмых, землякоў, проста чытачоў, якія любяць паэта. Аналагічны прэцэдэнт ужо меў месца ў гісторыі літаратуры: летам 1786 года ў шатландскім гарадку Кільмарнок выйшаў томік вершаў Роберта Бёрнса. У гісторыі ж беларускай літаратуры такое адбываецца ўпершыню.. Гэта — хіба не прызнанне народа?".

На свяце я бачыў пажылую жанчыну. Яна стаяла з букетам бэзу, не адважваючыся падысці да паэта, ад якога доўга не адыходзілі людзі, калі ён ужо не чытаў вершаў, і ўсё ж знайшла момант — падышла, працягнула яму кветкі і сказала:

— Беражы, сынок, сваё сэрца. Яно ў цябе можа не вытрываць.

Добра заўважыла, як маці, бо востра адчула слова паэта.

У той дзень Міхась падпісаў чытачам, якія выдалі яго "Світальных коней" на свае грошыкі, аж за шэсць соцень паасобнікаў.

Я яму патэлефанаваў:

— Ты асоба інертная ці не?

Ён мяне зразумеў:

— Ну, вядома, інертная. Я ж не падпісваю калектыўныя лісты ды заявы. Гэта не мой жанр. Я паэт.

Вось тут і адказ на шмат якія пытанні да літаратуры, у тым ліку і на гэтае: дзе, у якім слове і вобразе жыве сёння сэрца паэта?

Мы, здаецца, адышлі ад часоў нахабнага ідэалагічнага прэсінгу, калі агітпроп патрабаваў ад пісьменніка не так мастацкіх вобразаў, як мітынговай рыторыкі, выступленняў з рознымі лістамі, зваротамі, заявамі. І хоць агітпроп сканаў, яго схемы, формы, жанры засталіся, ды і масавы чытач, ім выхаваны, яшчэ жыве, ён усюды — у органах кіравання краінай, у прэсе, у самой літаратуры. Ён усё менш чытае мастацкія творы, абыходзіцца тым, што патрымае ў руках газетку і, магчыма, не ведае Башлакова, як не ведае іншых цудоўных мастакоў слова. Але ў яго перад вачыма мільгацяць прозвішчы пісьменнікаў пад адозвамі, лістамі, заявамі, зваротамі, ад якіх, калі па шчырасці, ці была калі-небудзь якая карысць? Была — тым, хто падпісвае? Жанр некаторым стаў настолькі мілы, што яны яго прыватызавалі — падпісваюць адны і тыя ж людзі, а калі заўважыш у шэрагу вядомых новае імя, то гэта абавязкова сваяк ці сябра некага з прыватызатараў, ці малады і свой, які павінен, нібы той донар, асвяжаць кроў прыватказманды.

Можа, не тут і прычына, што заява ў падтрымку Васіля Быкава неспадзявана стала, як выказалася газета, пустой адпіскай? І ці не таму яна з'явілася перад самым з'ездам пісьменнікаў, каб прыватызатарам жанру не растварыцца ў шматгалосай аўдыторыі з'езда. Бо няма сумнення, што кожны пісьменнік сёння падтрымае Васіля Быкава ў яго процістаянні з цемрашаламі.

Кожны пісьменнік мае свой літаратурны жанр, дзе ён — прафесіянал. У любым жанры ёсць месца палымянаму сэрцу, чыстаму сумленню, грамадзянскай мужнасці. І нельга дзяліць літаратуру не інертную і процілеглую ёй толькі па тым, піша ці не піша пісьменнік публіцыстыку, падпісвае ці не падпісвае розныя калектыўныя лісты ды заявы. Куды больш сэрца і сумлення, працы і мужнасці, як тая заява, патрабуе мастацкі твор, з якім пісьменнік доўга пакутуе сам-насам. Табуном жыць лягчэй ды і смялей. Але літаратура, кожны яе твор, ствараюцца ў цішыні і адзіноце. Такая яе прырода. Такі лёс творцы. І крыж цяжкі — абавязковая адзінота. Пра гэта павінен думаць кожны, хто спяшаецца судзіць пісьменніка, чапляць на яго ярлык інертнасці.

Гаварыць пра інертнасць у літаратуры мы і можам, і павінны. Але ў дачыненні да Саюза пісьменнікаў — як арганізацыі, да яго кіраўніцтва. Ці выканалі яны самую галоўную сваю задачу, ці абаранілі пісьменніка і яго права на слова, на твор, на кнігу? Не выканалі, не абаранілі. Пісьменнікі працуюць, з'яўляюцца таленавітыя творы літаратуры, але яны не даходзяць да чытача. І калі хтосьці выдаецца, то гэта не значыць, што "хтосьці" працуе больш за іншых ці піша лепш за іншых. Выдае той, хто ва ўладзе, пры добрай пасадзе, з уладаю ў згодзе.

Ідзём на з'езд. З якім настроем? Гэтак змрочна на свой з'езд наш пісьменнік не ішоў яшчэ ніколі. Няма надзеі ні на кнігу, ні на тое, што мы — адна сям'я. Нас раз'ядналі. Хто? І ўлада сваёй палітыкай у літаратуры, і цяжкасці жыцця, і штосьці яшчэ, можа, нават няўлоўнае...

А як жыць далей? Саюз пісьменнікаў патрэбны ці не патрэбны? Калі гэтакі, які ёсць, то можна і без яго.

Выбіраць новага старшыню? Новая мятла будзе месці па-новаму? Але якая яна павінна быць, каб мяла як трэба? Я сабе гэтакага ўяўляю. Гадоў 35—50, аўтарытэтны літаратурны талент, адкрыты ўсім і кожнаму, добразычлівы, каб не быў нічыім халуём і халуёў ненавідзеў, каб не аброслы хеўраю, не дзяліў пісьменнікаў на сваіх і чужых, не шукаў у чужой галаве вошы. Ці ёсць гэтакі? Хто ён? Паэт, адкрыты і звонкі, як чорт, кнігі якога, палюбіўшы, выдае народ і на паэтычным свяце якога я быў у Гомелі. Адкрыты ўсім вятрам, усім — брат. Які сказаў, як на духу:

Ад Радзімы,
Якой ні была б,
Не адракуся ніколі я.

Але ж такога ніхто на чале СП не паставіць. Улада не паставіць, бо ён ад яе будзе незалежны. Пісьменніцкая аўдыторыя не паставіць, бо нашы кіруючыя сябры-літаратары зрабілі ўсё, каб пра яго мала хто ведаў, і нават пяцідзесяцігадовы юбілей, які быў у гэтым месяцы, замаўчалі. Толькі стыхійны Фатнеў крыкнуў у сваім артыкуле, каб усе пачулі:

"Беларусы! Беражыце свайго лепшага паэта!"

Ці ж пачулі прыбітыя нягодамі беларусы?..

Яшчэ вылучае Рада Саюза пісьменнікаў? Не вылучыць і Рада. Ён не любіць, калі да яго прымазваюцца. Хвастоў не любіць. А ў Радзе ёсць хвост, які хоча прымазацца да будучага старшыні.

Ды і Рада ўжо ведае, каго ёй ставіць старшынёй. Таксама палешука, іншага. Такога, які нядаўна служыў Барысу Іванавічу. Івану Пятровічу, а заўтра будзе служыць Івану Пятровічу, Івану Іванавічу, Івану Мікалаевічу.

Але будзем жыць. І будзем пісаць. Бо калі жыве Беларусь, а яна будзе жыць, — павінна жыць яе літаратура.

Вы пасланы ў свет дзеля праўды, дабра і прыгажосці

Слова да беларускіх пісьменнікаў

Было так, што на адным з этапаў нашай гісторыі мы мелі самую вялікую ў Еўропе дзяржаву, самае моцнае войска, самую перадавую Канстытуцыю-статут, самую развітую мову. Але мы не мелі прыгожага пісьменства, не стварылі мастацкай літаратуры. І страцілі дзяржаву, войска, Канстытуцыю, свае назвы і імёны, страцілі літаратурную мову, пісьменства наогул.

На іншым этапе нашай гісторыі мы не мелі дзяржавы, войска, грошай, пісьменства, імя, не мелі права чалавекам звацца. Але мы стварылі і "Пінскую шляхту", і "Дудку беларускую", і "Паўлінку" ды шмат чаго яшчэ. Нарадзілася новая літаратурная мова — і ўслед адрадзіліся і пісьменства, і народ, і дзяржава. І новы этап нашай гісторыі пачаўся з таго, з чаго пачаўся ўвесь свет: "Напачатку было слова".

VII з'езд Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны вітае беларускіх пісьменнікаў — носьбітаў магутнага і далікатнага, дакладнага і мастацкага, грознага і мілагучнага, непаўторнага і невычэрпнага Беларускага Слова.

Мы лічым усіх вас разам і кожнага паасобку змагарамі за беларускую мову і дзейнымі сябрамі нашага Таварыства.

Вы — увасабленне сілы і таленту нашага народа. Гарадамі і мястэчкамі, вёскамі і засценкамі вы пасланы ў свет дзеля праўды, дабра і прыгажосці. І ўся Беларусь чакае ад вас большага плёну, чым могуць прынесці палітыкі, дыпламаты і банкіры. Бо вы — уладары слова, і вам вераць.

Калі хіснуцца Быкаў, Гілевіч, Барадулін, калі хіснуцца Бураўкін, Арлоў і кожны з паўтысячы беларускіх пісьменнікаў, тады абрынуцца апошнія апоры нашай нацыі, тады перарвуцца жыватворныя сілы нашай зямлі. Бо кожны з вас, як тая крыніца, што збіраецца па кропельцы, па жылачцы з падземных абшараў, каб прарвацца ў адным месцы і напаіць паўсвету, жывіць вялікія рэкі народнага жыцця, народнай культуры.

І мы сёння заклікаем вас, тых, хто прыйшоў у свет дзеля прыгажосці і мастацтва, мудрасці і справядлівасці, да мужнасці, стойкасці і адказнасці за ўсю Беларусь, за ўвесь беларускі народ. Бо менавіта вам Бог даў вялікае права несці ў свет Беларускае Слова.

Прынята на VII з'ездзе ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны".

ДАЙДЖЕСТ

Албанцы сдались международным силам



Сдача в плен Шекфета Муслиу.

После решения НАТО разрешить югославским силам безопасности занять последний сектор на административной границе Сербии и Косово командование албанской сепаратистской организации "Освободительная армия Прешево, Буяновац и Медведжи", действовавшей на юге Сербии, приняло решение сложить оружие и самораспуститься. Представителям KFOR сдался лидер этой организации Шефкет Муслиу и два его ближайших помощника. До этого международным миротворцам сдались 450 боевиков, подчинявшихся Муслиу.

Сам полевой командир провел встречу с заместителем командующего восточной группы международных сил Джином Рамене, после чего в селе Донье Корминяне боевики передали российским и американским военнослужащим из состава KFOR восемь автомобильных прицепов с оружием, боеприпасами и взрывчаткой. После сдачи оружия все албанцы были отпущены по домам.

"Ассошиэйтед Пресс".

Африканские страны создали аналог Евросоюза

На смену Организации Африканского единства, которой накануне исполнилось 38 лет, приходит Африканский союз. Новая организация, инициатором создания которой выступил ливийский лидер Муаммар Каддафи, создана по подобию Европейского Союза и предполагает экономическую и со временем политическую интеграцию стран Африки. Союз будет возглавляться высшим органом в составе глав государств, а также исполнительным советом из числа министров. Он будет иметь континентальный парламент, центральный банк, валютный фонд и суд.

Несмотря на то, что соглашение о создании Африканского союза подписали 40 из 53 африканских стран, основы проекта остаются не совсем ясными. По мнению наблюдателей, этническая и политическая разнородность африканских государств и их внутренние конфликты помешают работе новой организации по объединению континента. Для плодотворной работы Союза потребуется приложить немало усилий.

Африканский союз полностью заменит Организацию Африканского единства через год. По словам генерального секретаря Организации Салим Ахмед Салима, создание новой организации в корне изменит жизнь африканцев.

"Би-Би-Си Ньюс".

Издается Ветхий завет с фотографиями Клаудии Шиффер

В конце этого года в Великобритании ожидается выход в свет нового, не канонического, издания Ветхого завета. Дело в том, что новое издание текста будет снабжено фотографиями известных фотомоделей в образах библейских персонажей. Уже известны модели, которым предстоит воплотить образы Евы и Адама. Это Клаудия Шиффер и Маркус Шенкенберг. Газета также утверждает, что среди снимков, которые "украсят" издание, будет несколько эротических сюжетов.

Как пишет Daily Telegraph, инициаторами издания Ветхого завета с фотографиями моделей выступили 4 шведских продюсера. Авторами иллюстраций для книги станут также весьма известные в мире моды люди. Все они — всемирно известные профессиональные фотографы. Основной целью издания подобной книги авторы считают популяризацию чтения библейских текстов среди молодежи.

"Дейли Телеграф".

Администрация США хочет закупить в России комплексы С-300

Американская газета The New York Times опубликовала статью "Bush to Offer Aid to Moscow in Plan to End ABM Treaty", написанную журналистами Дэвидом Сэнгером и Томом Шэнкером. Авторы материала утверждают, что администрация президента Буша готовит пакет предложений к России, включающий приобретение российских зенитно-ракетных комплексов С-300, а также оказание России финансового содействия в модернизации системы раннего предупреждения, а также проведение совместных учений по обнаружению и уничтожению баллистических ракет. Таким образом, утверждают авторы, американская сторона намерена добиться от России положительной реакции на планы США в области противоракетной обороны и на "сотрудничество в деле пересмотра российско-американского договора по ПРО".

"Нью-Йорк Таймс".

Похищен почетный консул Литвы в Ливане

В Ливане похищен почетный консул Литвы ливанский гражданин Раймонд Саркис. Брошенная машина консула найдена в горах в районе деревни Зикрит в 15 километрах от Бейрута. Похитители уже связались с семьей консула и потребовали выкуп, сумма которого не разглашается. Служба безопасности ведет поиски похищенного и злоумышленников.

По данным Central Europe Review, в прошлом году Раймонд Саркис был освобожден с должности почетного консула Министерством иностранных дел Литвы. Никакого официального заявления по этому поводу не последовало, однако, по некоторым данным, Саркис был уволен по подозрению в контрабанде сигаретами несколько лет назад.

РИА "Новости".

"Изудзу" уволит 10 тысяч рабочих

В ближайшие три года автомобильный концерн Isuzu Motors Ltd резко сократит количество рабочих мест. Isuzu, крупнейший производитель легких грузовиков в Японии, планирует за три года уволить 9700 рабочих, что составляет более 25% служащих компании. В настоящее время общее количество рабочих Isuzu — 38 тыс. человек. Ожидается, в частности, что к 2005 году компания полностью закроет завод грузовиков Кавасаки.

Две тысячи людей разделись перед фотографом в центре Монреаля

В Канаде в центре Монреаля прошла необычная акция: американский фотограф делал групповой снимок более двух тысяч обнаженных людей. Местные власти разрешили проведение этого мероприятия. По замыслу 34-летнего Спенсера Тьюника, все участники акции разделись догола и легли в разных позах на землю. При этом температура воздуха была 13 градусов, а все действие продлилось около 50 минут. На протяжении этого времени полицейский заслон ограждал участников от любопытных прохожих. Сам Тьюник ожидал, что на его предложение позировать перед фотокамерой без одежды откликнутся не более 300 добровольцев. Как заявил фотограф, получившиеся снимки будут выставлены в следующем месяце в монреальском Музее современного искусства.

Спенсер Тьюник уже делал подобные фотографии обнаженной натуры в Сан-Франциско, Лондоне, Риме и Иерусалиме. Эти работы известны по всему миру. "Я использую тело только в качестве образа, как объект искусства, а не сексуальный объект", — сказал фотограф.

"Рейтер".

Вахид приказал спецслужбам "навести порядок в стране"

Президент Индонезии Абдурахман Вахид сделал официальное заявление, в котором объявил о возможном распаде страны в случае его импичмента. В том же заявлении президент Вахид сообщил о том, что им отдан приказ Министерству национальной безопасности страны "принять все возможные меры по наведению порядка в стране". Вместе с тем Вахид пока отказался официально ввести в стране чрезвычайное положение, о чем он предупреждал ранее.

Между тем сегодня днем в восточной части острова Ява возобновились столкновения сторонников и противников президента Вахида. О жертвах и пострадавших сведения пока не поступали.

В индийском штате Ассам от малярии погибли 46 человек

На северо-востоке Индии в штате Ассам за прошедшие 2 недели от малярии погибли 46 человек. В настоящее время распространение заболевания остановлено, однако министр здравоохранения Индии Бумидар Бурман заявил, что число жертв, возможно, увеличится. Нехватка медперсонала и задержка распыления ДДТ усложнила ситуацию в этом году, отмечает Бурман. Это потребовало привлечения противоэпидемиологических сил из других регионов страны.

"Рейтер".

Таліца: няма каму старыцца

Прытулілася вёсачка Таліца ледзь не ўпрытык да лесу. Да яго ад крайняй хаты — крокаў пяцьдзесят, а да могілак, дзе бялеюць шэрагі помнікаў, — і таго меней. У вёсачцы дажываюць век сем пенсіянераў. У трох хатах — па двое, муж і жонка, у чацвёртай — адзінокая бабуля. У сямі хатах, не старых, ашаляваных, з добрымі агароджамі, атабарыліся гарадскія, са Слуцка, дачнікі. Прыязджаюць сюды вясной — шчыраваць на градках. Улетку — з унукамі, восенню вяртаюцца зноў на свае гарадскія кватэры.

А пасля вайны тут было дваццаць пяць жылых дамоў і ў кожным па трое-пяцёра дзяцей.

Як жывецца сёння гэтай сямёрцы карэнных талюкоў? З такім пытаннем да іх звярнуўся наш пазаштатны карэспандэнт.

Павел Лявонцьевіч Кернажыцкі, 79 гадоў, інвалід Вялікай Айчыннай вайны.

— Сорак пяць гадкоў жывём тут з Людмілай Ягораўнай. Мы з Салігорскага раёна, з вёскі Кутнева. Упадабалася новае месца адразу: блізка лес, сенажаць, паша для хатняй жывёлы. Абое паляводамі прарабілі ў брыгадзе ўсё жыццё. Мне як інваліду вайны пенсію вызначылі апошні раз 88 тысяч рублёў, у жонкі — 42 тысячы. Агарод маем 33 соткі, трымаем карову, курэй. Аўталаўка ў чацвер прыязджае ў вёску, прывозяць хлеб, батоны, крупы, цукар, гарэлку — абы грошы былі. Толькі, бачу, цэны растуць амаль кожны тыдзень. Але ж я на савецкую ўладу крыўды не нашу, нам нядрэнна жылося, бо і калгас наш калісьці на добрым рахунку ў раёне быў, не тое, што цяпер.

— А дзеці вашы, мусіць, так, як вы, не думалі? Пакінулі ж вёску. Як кажуць — ад дабра дабра не шукаюць.

— Яно-то так, з маладых у вёсцы амаль нікога пасля вайны не засталося на пастаяннае жыхарства. Усе навастрылі лыжы ў гарады. Нашы — таксама. Сын Коля ў Слуцку на цукровым камбінаце, другі, Валера, і дачка Ніна працуюць у Салігорску на калійным камбінаце. У хлопцаў ёсць кватэры, пакуплялі машыны і праведваюць нас з жонкай.

Да размовы далучаецца Людміла Ягораўна, пенсіянерка, па ўзросце амаль равесніца мужа:

— Адно дрэнна ў нас — не засталося ў вёсцы ні аднаго каня. Каб засеяць агарод, прывезці з лесу дроў, трэба за чатыры вярсты ісці ў суседнюю вёску Боркі, прасіць брыгадзіра, там на ферме трымаюць рабочага каня. Яго выдзяляюць у першую чаргу сваім пенсіянерам, а іх там чалавек дваццаць. Чакаеш сваёй чаргі, перажываеш. А трымаць свайго каня нашым старым людзям не па сіле.

— А як з медыцынскім абслугоўваннем справы? (Да прыгараднага аўтобуса, каб паехаць у горад у паліклініку, трэба ісці чатыры кіламетры. Сам пешкі адмераў).

— Званім па тэлефоне ў сельскую амбулаторыю, яна ў цэнтры калгаса, у вёсцы Мялешкі. Калі каму вельмі дрэнна з сэрцам ці яшчэ па якой немачы, то прысылаюць "хуткую дапамогу". Уколы дадуць, таблеткі, а калі трэба, то і адвязуць у сельскую бальніцу. Але як прыходзяць веснавыя клопаты, то няма калі і хварэць за работай.

Вячаслаў Мікалаевіч Руэт, 70 гадоў, былы трактарыст:

— Паўкалваў я за свой век — 45 гадоў адрабіў на трактарах. І на гусенічных, і на колавых, і на камбайнах збожжавых. 28 уборачных правёў на іх. Здаралася, што пасля работы ў полі, а гэта ўжо прыцемкамі, пакідаў трактар на ноч ля свайго дома. Не было сілы гнаць за дзесяць кіламетраў на мехдвор, а дамоў вяртацца пешшу. То старшыня калгаса мяне ўпікаў потым: "Што ты, Руэт, у сябе дома МТС адкрыў?". Не дакажаш яму, шо сэканоміў гэтымі начоўкамі не адно вядро саляркі, яе тады было мерана-нямерана. А як пайшоў на пенсію, то адчуў, што без справы сядзець дома не змагу — прывык да трактара. Купіў у калгасе па дзяшоўцы Т-25, падрамантаваў, і ён мне ўжо дзесяты год спраўна служыць. Абзавёўся неабходным сельгасінвентаром, таму каня ў брыгадзіра не прашу, апрацоўваю свае соткі пры доме і ў полі трактарам. На ім і ў лазню ў суботу езджу ў вёску Мялешкі, бо ў нас сваёй няма.

— Пенсію вы хоць добрую зарабілі?

— Каб жа так! Усяго 51 тысячу! На хлеб, сякія-такія прывазныя прадукты, на салярку для трактара ледзь хапае.

Споведзь мужа дапаўняе жонка, Ніна Канстанцінаўна, равесніца яму па ўзросце.

— Акрамя здароўя, усё ў нас добра, нашы бацькі так не жылі. Але ж на калгаснай рабоце здароўе падарвала, ціск крывяны высокі, сэрца пабольвае. Я ж, чалавеча, у брыгадзе паляводам працавала, потым даяркай на ферме, тады яшчэ ўручную даілі. Устанеш у чатыры гадзіны раніцы — і пайшла. Вечарам дамоў вяртаешся ў дзесяць гадзін. Хадзіла не раз ноччу на ферму малых цялят паіць малаком.

Слухаў я гэтых ссівелых, шмат перажыўшых у жыцці людзей і здзіўляўся, як нясмела яны выказвалі прэтэнзіі да мясцовых уладаў, трывогу за будучае дзяцей, унукаў. Настрой ва ўсіх адзін: "Ёсць хлеб на стале, ёсць за што выпіць ад душэўнай скрухі ў горкую часіну адзіноты — то і добра, няма чаго Богу грашыць".

Па тэлевізары яны глядзяць дзве дзяржаўныя праграмы — расійскую і сваю, беларускую. Вераць са старой, савецкай пары кожнаму слову з экрана, з радыёдынаміка — таксама. Незалежныя газеты сюды не даходзяць. Гэтым людзям ужо непатрэбен і магазін, будынак якога, без вокнаў і дзвярэй, з прабітым дахам, стаіць пры ўездзе ў вёску, ні брыгадны клуб, у які я пасля дэмабілізацыі ў 1951 годзе з сябрамі-аднавяскоўцамі не раз прыходзіў на танцы (тады ў Таліцах было чалавек дзесяць хлопцаў і дзяўчат).

У 60-я гады, калі ўлады загаварылі пра "неперспектыўныя" вёскі, якія, маўляў, аджылі свой век, клуб перавезлі на цэнтральную сядзібу калгаса, пад кантору. А ў суседняй вёсачцы Ліпнікі пад гэтую хвалю бальшавіцкага дурману трапіла і пачатковая школа. Вось і атрымалі тое, што прадбачылі мудрыя дзядулі-старажыхары: у абедзвюх вёсках сёння ўжо няма каму болей старыцца. Тым больш — працаваць.

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

СПОРТ

"Белшына" робіць кубкавы хет-трык

Уладальнікам дзесятага кубка Беларусі па футболе стала бабруйская "Белшына". Гэта трэці поспех у гісторыі каманды

Фінал-2001 атрымаўся ўпартым і малавідовішчным. На працягу ўсёй сустрэчы каманды стварылі ўсяго пару-тройку момантаў, якія можна было назваць галявымі. Як вынік — асноўны час паядынку скончыўся нулявой нічыёй. Але праз пяць хвілін пасля пачатку дадатковага часу бабруйчане разгушквалі на руках свайго трэнера. "Залаты" гол правёў Эдуард Градабоеў.

Вось што сказалі трэнеры каманд-фіналістак:

Вячаслаў Акшаеў("Белшына"): "Гульня прайшла ў асноўным пад дыктоўку "Славіі" з яе тэрытарыяльнай перавагай. Мы гулялі толькі на вынік, бо кошт фіналу вельмі высокі. Мы нагадалі футбалістам пра асаблівы падтэкст кубкавай гульні. Хлопцы праявілі маральна-валявыя якасці і дасягнулі патрэбнага выніку. Жадаю мазыранам поспеху ў лізе чэмпіёнаў".

Улада Петравіч("Славія"): Я не хачу пакрыўдзіць калегу, якога паважаю, але думаю, што гэтая гульня па якасці не была фінальнай. Мне здаецца, што некаторыя футбалісты "Славіі" сёння проста не хацелі перамагчы. Наша каманда дапусціла многа памылак. Шкада, што Раман Васілюк — адзіны з нашай каманды, хто ўваходзіць у склад зборнай Беларусі, некаторую частку чэмпіянату гуляе дрэнна. Бо добрай гульні ад яго чакае не толькі "Славія", але і ўвесь беларускі футбол. Таксама жадаю "Белшыне" поспехаў на еўраарэне.

Стала вядома: еўракубкавыя гульні "Белшына" будзе праводзіць у Мінску, бо стадыён у Бабруйску пакуль не гатовы да прыёму матчаў такога ўзроўню. Да міжнародных стартаў кожная з каманд плануе ўзмацніцца: "Белшына" — мясцовымі спартсменамі, а "Славія" плануе праглядзець футбалістаў з бліжняга замежжа.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Улыбнемся...

— Что будет, если построить рыночный социализм в пустыне Сахара?

— Начнутся перебои с песком.

***

Выступает депутат парламента:

— Товарищи, пора уже определиться. Те, кто за капитализм, пусть садятся справа, а те, кто за социализм, — слева.

— А если я хочу работать, как при социализме, а жить, как при капитализме? — раздается голос из зала.

— Тогда вы садитесь в президиум.

***

В одной "банановой" республике выпустили марку с изображением главы государства. Через несколько месяцев тот вызывает министра связи и спрашивает:

— Как народ покупает марку с моим изображением?

— Плохо — она не приклеивается на конверт.

— Что, они плюют не на ту сторону?!

***

Муж ложится в постель и говорит жене:

— Когда я захочу выпить, ты меня разбуди?

— А как я узнаю, что ты хочешь выпить?

— Ты разбуди...

***

Разговаривают два мужика.

— Ты пьешь?

— Только по праздникам.

— А по каким праздникам?

— Когда водка есть — тогда и праздник.

***

Разговаривают два мужика.

— Мне врач разрешает выпить только по 100 граммов спиртного в день.

— Ты выполняешь его указания?

— Очень строго. Пью по 100 граммов в день уже в счет 2005 года.

***

Разговаривают два мужика.

— Ты пьешь?

— Если это вопрос, то "нет", а если предложение, то "да".

***

Адвокат звонит своему клиенту:

— Сегодня ночью скончалась ваша теща. Что заказать: погребение или кремацию?

Клиент подумал и ответил:

— Закажите и то и другое, не будем рисковать.

***

Мать абитуриентки разговаривает с профессором.

— Я очень волнуюсь. А вдруг моя дочь не поступит в институт?

— Ну что вы! Давайте поспорим на 1000 долларов, что поступит.

***

Жена спрашивает у мужа:

— Ты не знаешь, где наша книга "Как дожить до 100 лет"?

— Я ее сжег.

— Зачем?

— Ее начала читать твоя мама.

***

Иностранцы в Беларуси. Видят, как на аллее один рабочий аккуратно копает ямки, а второй идет вслед за ним и аккуратно эти ямки закапывает. Гости удивляются. Один не вытерпел и спрашивает:

— Что это вы делаете? Один копает, второй закапывает?

— Я не второй, я третий. Второй не вышел на работу. Он должен был деревья сажать.

Собрал Л.ВАСИЛЬЕВ, житель г.Гродно.

ВАШЕ ЗДОРОВЬЕ

БЫСТРАЯ ХОДЬБА

Теперь ни у кого не возникает сомнений, что для сохранения здоровья необходимо постоянно выполнять физические упражнения. Несмотря на это в наше время большинство людей ведут малоподвижный образ жизни, а это, как правило, способствует ряду заболеваний. Регулярные физические нагрузки имеют комплексное целительное влияние на все системы и функции организма.

Не следует забывать, что при выполнении физических упражнений улучшается кровообращение. В результате этого клетки нашего организма обогащаются необходимыми веществами и энергией, а также освобождаются от вредных элементов. И это особенно важно при неблагоприятных экологических условиях.

Здоровье нашего организма в основном зависит от состояния мышц. Ограничение в пище или голодание на некоторое время нормализуют массу тела, но со временем потерянные килограммы возвращаются. Обеспечить необходимую потерю каллорий помогут физические упражнения, а мышечный "корсет" изменит ваш внешний вид.

Правильно подобранные нагрузки улучшают работу главной мышцы нашего организма - сердца, укрепят нервную систему, психологическое состояние человека.

Но необходимо помнить - нагрузки должны быть адекватными физическому состоянию человека. Поэтому прежде чем начинать занятия, следует проверить функциональное состояние своего организма.

Выбор средств тренировки широкий. Наиболее доступны летом бег, ходьба, плаванье, велосипед, общеукрепляющие гимнастические упражнения. Скажем, благодаря бегу активизируются все системы. К тому же бег не требует спортивных сооружений.

Однако немало людей не могут бегать из-за чрезмерного веса, болезни суставов, сердца, преклонного возраста. В таком случае нужно больше ходить пешком. Ежедневная ходьба в надлежащем темпе - это минимальный, но обязательный шаг к здоровой жизни.

Быстрая ходьба - королева упражнений. Возможностей для ее выполнения достаточно: пешком на работу и домой, ступеньки вместо лифта, вечерние прогулки. Кстати, в Японии очень популярно правило: ежедневно делать десять тысяч шагов. Можно совмещать ходьбу с бегом. Пробежать, скажем, 200 метров, а потом столько же пройти, чтобы не было переутомления. Постепенно дистанции ходьбы и бега следует увеличивать. И еще одно пожелание: заниматься ходьбой и бегом желательно там, где чистый воздух.

Полезно и систематическое посещение бассейна. Плаванье закалит организм, укрепит нервную систему, станет наилучшей профилактикой заболеваний позвоночника и суставов.

Необходимо знать, что эффект дают лишь систематические занятия, поэтому находите ежедневно хотя бы час для своего здоровья, и оно подарит вам годы счастливой жизни.

Вторник, 29 мая

БТ

06.30 Доброе утро, Беларусь!
07.00 Новости.
07.10 Доброе утро, Беларусь!
08.10 **"Все мои дети".** Сериал.
09.00 Новости.
09.15 **"Тайный мир Алекс Мак".** Сериал для детей (Англия—Германия).
09.40 Стадион.
10.10 Документальный сериал "В фокусе". Фильм "Тайна камней Ики" (Германия).
11.00 Новости.
11.15 **"Человек моря".** Сериал (Аргентина).
12.05 Теленавигатор.
12.30 Арсенал. Программа об армии.
13.00 Новости.
13.10 **"Государственная граница".** Фильм седьмой **"Соленый ветер"** ("Беларусьфильм"). 1-я серия.
14.20 Сфера. Научно-популярная программа.
14.40 Документальный сериал "Сокровища мировой культуры" (Германия).
15.00 Новости (с сурдопереводом).
15.10 "Сказки отца Кастора". Мультсериал (Международный французский канал).
15.20 "Все на орбиту!" Познавательный сериал для детей (Международный Французский Канал).
15.35 **"Тайный мир Алекс Мак".** Сериал для детей (Англия—Германия).
16.05 "5 x 5". Информационно-развлекательная программа **для старшеклассников.**
17.00 **"Все мои дети".** Сериал.
18.00 Новости.
18.20 Зона Икс.
18.35 "Москва — Минск".
18.55 С.Боннэр и Е.Радзивилович в психологическом детективе **"Тайная защита"** (Швейцария—Италия—Франция). 1-я серия.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама. Информационный канал.
22.00 **"Человек моря".** Сериал (Аргентина).
22.50 Спорт-курьер.
23.00 Ток-шоу "Будни". Обязательное распределение.
23.45 Новости.

ОРТ

08.00 Новости.
08.15 **"Воздушные замки".** Сериал.
09.15 "Кто хочет стать миллионером?".
10.25 Пока все дома.
11.00 Новости.
14.00 Новости.
14.20 Царь горы.
14.45 ...До шестнадцати и старше.
15.20 Мультсериал "Покемон".
15.45 "Ералаш".
15.55 **"Воздушные замки".** Сериал.
17.00 Новости.
17.25 "Все путешествия команды Кусто".
17.55 Как это было. Диссиденты на Красной площади. 1968 год.
18.40 **"Убойная сила: Миссия выполнима-3".**
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Фильм **"Расскажи мне о себе".**
22.45 Русский экстрим.
23.20 Новости.
23.35 Детектив **"Признание".**

РТР

08.00 Вести.
08.15 Боевик **"Отряд "Д".**
10.00 Вести.
10.30 **"Санта-Барбара".** Сериал.
16.00 Вести.
16.30 **"Простые истины".** Сериал.
17.00 Сериал **"Сеть".**
18.00 **"Комиссар Рекс".** Сериал.
19.00 Вести.
19.30 Вести — Москва.
19.50 Авторская программа Елены Масюк "Ханский шахтер".
20.20 Боевик **"База".**
22.00 Вести.
22.30 После "Вестей".
22.40 Подробности.
22.50 Мужчина и женщина. Владимир Ильич Толстой.
23.45 Детектив **"Преступление".**
01.45 Прогноз погоды.

КУЛЬТУРА

07.05 Новости культуры.
07.20 После новостей.
07.40 **"Три сезона".** Худ.фильм. Часть 1-я.
08.35 Русь-деревня.
09.20 Машины времени.
09.55 Встреча с Жилем Апапом.
10.20 "О пользе традиций, или Русские в Англии".
11.30 Новости культуры.
11.40 **"Вам и не снилось".** Худ.фильм.
13.30 Новости культуры.
13.45 Вместе с Фафалей.
14.00 "Любовь". Док.фильм.
14.25 "Пушкин и судьбы русской культуры".
15.00 Новости.
15.10 **"Назад в Шервуд".** Сериал.
15.35 "Бедная Лиза". Мультфильм.
15.50 Дело житейское.
16.20 "Вижу цель!".
16.45 "В мире образов Резо Габриадзе".
17.30 Новости культуры.
17.40 "Ноу-хау". Тележурнал.
17.55 "Кремль музыкальный".
18.20 "Цитаты из жизни". Владимир Бахтин.
19.00 Вечерняя сказка.
19.10 "Ох, уж эти детки". Мультсериал.
19.30 Новости культуры.
19.55 Русь-деревня.
20.40 После новостей.
21.00 Третий звонок.
21.25 Свингующий Ростов.
22.05 **"Три сезона".** Худ.фильм. Часть 1-я.
23.00 Новости культуры.

НТВ

05.00, 05.30, 06.00, 06.30, 07.00, 07.30 Сегодня утром.
05.15, 06.15, 07.15 Спорт, погода.
05.20, 06.35 Криминал.
05.35, 06.50 Большие деньги.
05.45, 07.20 Впрок.
06.20, 07.40 Карданный вал.
07.50 Сериал **"День рождения Буржуя".**
09.00 Сегодня.
09.25 Сериал **"Любовь и тайны Сансет Бич".**
10.25 Криминал. "Чистосердечное признание".
11.00 Сегодня.
11.25 Фильм **"Бесприданница".**
13.00 Сегодня.
13.30 Старый телевизор.
14.40 Впрок.
15.00 Сегодня.
15.30 Сериал **"Элен и ребята".**
16.10 Сериал **"Страсть".**
17.05 "О, счастливчик!"
18.00 Сегодня.
18.30 Герой дня.
18.45 Криминал.
19.05 Сериал **"Золото Югры".**
20.15 Совершенно секретно. Информация к размышлению.
21.00 Сегодня.
21.50 Сериал **"Месть без предела".**
23.00 Сегодня.
23.25 Фильм **"Долина Теннесси".**

TV-6

05.00 День за днем.
05.45 Дорожный патруль.
06.00 День за днем.
08.00 Новости.
08.20 Час быка.
08.25 "Тушите свет".
08.40 Сериал **"След оборотня".**
09.50 Сериал **"Пси-фактор-IV".**
10.45 Сериал **"Третья планета от Солнца".**
11.15 Телемагазин в Минске.
11.30 WWW. TV6.RU.
11.45 "Рабочий полдень".
12.25 День за днем.
14.00 "Сегодня" с...
14.30 Сериал **"В мире женщин".**
15.40 Телемагазин в Минске.
16.30 "Сеть".
17.10 Сериал **"Третья планета от Солнца".**
17.45 Дорожный патруль.
18.00 "Сегодня" с...
18.45 Сериал **"След оборотня".**
20.00 "Сегодня" с...
20.40 "Тушите свет".
20.50 Программа для взрослых "Ох, уж эти дети!" с А. Олейниковым.
22.00 "Сегодня" с...
22.35 Дорожный патруль.
22.50 Сериал **"Пси-фактор-IV".**
23.55 ДИСК-канал.
00.30 Дорожный патруль.

СТВ+RenTV

06.00 "Железный человек". Мультсериал.
06.30 "Диплодоки". Мультсериал.
07.00 Автопанорама.
07.15 Новости СНГ.
07.30 Музыка на СТВ.
07.45 "Случайный свидетель".
08.30 Новости "СТВ — 24 часа".
08.45 Боевик **"Алмаз смерти".**
10.35 "Дискавери" на СТВ.
10.55 "Виртуальный мир".
11.05 Комедия **"Если бы у меня был миллион".**
12.50 "1/52". Спортивное обозрение.
13.20 "Киноафиша Минска".
13.30 Новости СТВ.
13.45 Международные спортивные новости на СТВ.
14.00 **"Пляж".** Сериал.
15.00 **"Маросейка, 12".** Сериал.
16.00 "Железный человек". Мультсериал.
16.30 "Диплодоки". Мультсериал.
17.00 **"Потом появился ты".** Сериал.
17.30 Новости СТВ.
17.45 Гороскоп СТВ.
17.50 "Культурная жизнь Минска".
18.00 "Раузан". Теленовелла.
19.00 "Случайный свидетель".
19.30 Новости "СТВ — 24 часа".
19.45 "Виртуальный мир".
19.55 "Культурная жизнь Минска".
20.00 **"Мэш".** Сериал.
20.30 Международные спортивные новости на СТВ.
20.45 "Вечарніца".
21.00 **"Марш Турецкого".** Сериал.
22.10 Триллер **"Защитник".**
00.15 Автопанорама.
00.30 Комедия **"Если бы у меня был миллион".**

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04.
E-mail : nv@irex.minsk.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. Кнорына, 50. Падпісаны ў друк у 15.00. Фармат А-2. Тыраж: 41180 экз. Заказ №428.